АДДЗЕЛ ІДЭАЛАГІЧНАЙ РАБОТЫ, КУЛЬТУРЫ І ПА СПРАВАХ МОЛАДЗІ
ЛОЕЎСКАГА РАЙВЫКАНКАМА

ДУК “МУЗЕЙ БІТВЫ ЗА ДНЕПР”

| | |
|---|---|
| УЗГОДНЕНА | ЗАЦВЯРДЖАЮ |
| Начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Лоеўскага райвыканкама | Дырэктар ДУК “Музей бітвы за Днепр” |
| _________ Л.М.Фядорыва | _________ К.У.Сямашка |
| “___”___________ 20__г. | “___”___________ 20__г. |

# ПРАВІЛЫ НАВЕДВАННЯ ДУК “МУЗЕЙ БІТВЫ ЗА ДНЕПР” І РАБОТЫ НАВЕДВАЛЬНІКАЎ З МУЗЕЙНЫМІ ПРАДМЕТАМІ І (АБО) МУЗЕЙНЫМІ КАЛЕКЦЫЯМІ

Лоеў 2019

## РАЗДЗЕЛ 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзеныя правілы скіраваныя на забеспячэнне парадку і бяспекі пры наведванні ДУК “Музей бітвы за Днепр” (далей — Музей), паляпшэння абслугоўвання наведвальнікаў і абавязковыя для выканання.

2. Дадзеныя правілы распрацаваныя ў адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб культуры і ўстанаўліваюць парадак доступу да экспазіцыйна-выставачных залаў Музея, музейных фондаў, работы з музейнымі прадметамі і (або) музейнымі калекцыямі.

3. Дадзеныя правілы работы зацвярджаюцца дырэктарам Музея і ўзгадняюцца аддзелам ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Лоеўскага райвыканкама і размяшчаюцца ў даступным месцы (інфармацыйным стэндзе, табло і г.д.).

## РАЗДЗЕЛ 2
## НАВЕДВАННЕ МУЗЕЯ

4. У склад Музея ўваходзяць пастаянная экспазіцыя і выставачная зала Музея, размешчаныя ў будынку Музея па адрасе вул. Савецкая, д. 3, г.п. Лоеў, а таксама пляцоўка баявой тэхнікі пад адкрытым небам, размешчаная на пл. Перамогі г.п. Лоева.

5. Пастаянная экспазіцыя і выставачная зала музея адкрытыя для наведвання згодна з зацверджаным дырэктарам Музея рэжымам работы Музея.

Кошты на ўваходныя квіткі, экскурсійнае абслугоўванне і іншыя платныя паслугі Музея вызначаюцца згодна з зацверджаным дырэктарам Музея “Прэйскурантам на платныя паслугі, якія аказвае насельніцтву ДУК «Музей бітвы за Днепр»”.

6. Пляцоўка баявой тэхнікі адкрыта для наведвання кругласутачна. Наведванне пляцоўкі бясплатнае.

7. Уваходны квіток прадугледжвае магчымасць аднаразовага наведвання экспазіцыі і (альбо) выставы Музея ў дзень продажу квітка. Для паўторнага наведвання Музея набываецца новы ўваходны квіток.

8. Экскурсійнае абслугоўванне наведвальнікаў Музея праводзіцца як на падставе папярэдняй заяўкі, так і па заяўцы, зробленай непасрэдна падчас наведвання Музея. Пры гэтым экскурсійныя групы, якія зрабілі папярэднюю заяўку, маюць прыярытэт у абслугоўванні.

9. Экскурсійнае абслугоўванне ў Музеі могуць праводзіць толькі супрацоўнікі Музея. Аб’ём правядзення экскурсій і лекцыйнай нагрузкі супрацоўнікаў музея вызначаецца згодна з зацверджанымі Міністэрствам

культуры Рэспублікі Беларусь “Нормамі экскурсійнай і лекцыйнай нагрузкі для навуковых супрацоўнікаў і загадчыкаў аддзелаў дзяржаўных музеяў сістэмы міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь”.

Правядзенне экскурсій няштатнымі экскурсаводамі Музея можа праводзіцца толькі пасля ўзгаднення з кіраўніцтвам Музея.

10. Экспазіцыйна-выставачная прастора Музея можа быць закрыта альбо абмежавана для наведвання на час правядзення музейных мерапрыемстваў і (альбо) па тэхнічных прычынах.

11. Наведвальнікі маюць права:

11.1. наведваць Музей у адпаведнасці з рэжымам яго работы і карыстацца яго паслугамі ў адпаведнасці з зацверджаным прэйскурантам;

11.2. праводзіць кіна-, фота- і відэаздымкі на аматарскім абсталяванні без выкарыстання бліскавіцы.

12. Наведвальнікі абавязаныя:

12.1. захоўваць квіткі да заканчэння агляду пастаяннай экспазіцыі і (альбо) выставаў Музея і прад’яўляць іх па першым патрабаванні супрацоўнікаў Музея;

12.2. захоўваць чысціню і парадак;

12.3. прытрымлівацца цішыні, не ствараць сітуацый, якія могуць паўплываць на стан захаванасці музейных прадметаў;

12.4. выконваць рэжым работы Музея;

12.5. пры наведванні экспазіцыйна-выставачных залаў Музея пакідаць у гардэробе вопратку і галаўныя ўборы;

12.6. у выпадку знаходжання безнаглядных рэчаў неадкладна паведаміць пра іх супрацоўнікам Музея;

12.7. выконваць патрабаванні супрацоўнікаў Музея па выкананню Правілаў.

13. Наведвальнікам забараняецца:

13.1. праходзіць у экспазіцыйна-выставачныя залы Музея з заплечнікамі і кайстрамі вялікіх памераў, у вопратцы і галаўных уборах, з ежай і напоямі;

13.2. праходзіць з жывёламі;

13.3. дакранацца да экспанатаў і музейнага абсталявання;

13.4. паліць у памяшканні Музея;

13.5. знаходзіцца ў стане алкагольнага, наркатычнага альбо таксічнага ап’янення;

13.6. карыстацца сродкамі мабільнай сувязі і гучна размаўляць у памяшканні Музея;

13.7. праходзіць у службовыя памяшканні Музея без адпаведнага дазволу кіраўніцтва Музея;

13.8. праводзіць відэа- і фотаздымкі з выкарыстаннем прафесійнага абсталявання без адпаведнага дазволу кіраўніцтва Музея;

13.9. замінаць экскурсійнаму абслугоўванню і (альбо) азнаямленню з экспазіцыяй паасобных наведвальнікаў Музея.

14. Наведвальнікі, якія адмаўляюцца выконваць дадзеныя Правілы, могуць быць выдаленыя з тэрыторыі Музея без звароту кошту квітка.

## РАЗДЗЕЛ 3
## ПРАВЫ МУЗЕЯ

15. Музей мае права:

15.1. змяняць працягласць работы экспазіцый у бок павелічэння ці скарачэння ў выпадку ўзнікнення неабходнасці з папярэднім паведамленнем наведвальнікам пра гэта;

15.2. адмовіць у абслугоўванні асобам у стане алкагольнага, наркатычнага альбо таксічнага ап’янення;

15.3. скарачаць працягласць экскурсійнага абслугоўвання ў выпадку ўзнікнення неабходнасці з папярэднім паведамленнем наведвальнікам пра гэта;

15.4. закрываць цалкам альбо абмяжоўваць допуск у экспазіцыйна-выставачныя залы у сувязі з правядзеннем музейных мерапрыемстваў і (альбо) па тэхнічных прычынах.

## РАЗДЗЕЛ 4
## ПЕРАЛІК КАТЭГОРЫЙ ГРАМАДЗЯН, ЯКІЯ МАЮЦЬ ПРАВА НА БЯСПЛАТНАЕ І (АЛЬБО) ІЛЬГОТНАЕ НАВЕДВАННЕ МУЗЕЯ

16. Правам бясплатнага (ільготнага) наведвання Музея для агляду экспазіцый, створаных на аснове ўласных музейных фондаў, карыстаюцца ўсе катэгорыі грамадзян не радзей за адзін раз у месяц у дзень, вызначаны Музеем.

17. Права бясплатнага (ільготнага) наведвання Музея на пастаяннай аснове маюць наступныя катэгорыі грамадзян (па прад’яўленню адпаведнага пасведчання):

17.1. інваліды;

17.2. ветэраны Вялікай Айчыннай вайны;

17.3. ваеннаслужачыя тэрміновай ваеннай службы, грамадзяне, якія праходзяць альтэрнатыўную службу;

17.4. дзеці да сямі гадоў, дзеці-сіроты, дзеці, якія засталіся без апекі бацькоў, асобы з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў;

17.5. асобы з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, якія атрымліваюць дашкольную, агульную сярэднюю, спецыяльную, прафесійна-тэхнічную, сярэднюю спецыяльную, вышэйшую адукацыю;

17.6. музейныя работнікі, чальцы ICOM, ICOMOS.

## РАЗДЗЕЛ 5
## РАБОТА З МУЗЕЙНЫМІ ПРАДМЕТАМІ І (АБО) МУЗЕЙНЫМІ КАЛЕКЦЫЯМІ

18. Музейныя прадметы і (або) музейныя калекцыі з’яўляюцца даступнымі для візуальнага агляду наведвальнікаў Музея падчас іх наведвання музейных экспазіцый.

19. Работа наведвальнікаў Музея з музейнымі прадметамі і (або) музейнымі калекцыямі, якія знаходзяцца ў фондасховішчах Музеяў, ажыццяўляецца на падставе пісьмовай заявы, у якой указваецца дакладная і аргументаваная мэта работы, і пісьмовага дазволу кіраўніка Музея па ўзгадненню з галоўным захавальніка фондаў Музея.

20. Пры наяўнасці страхавых копій любых існуючых фарматаў музейных прадметаў, якія ўяўляюць аўтэнтычныя формы пісьменнасці і выяўленчага мастацтва (дакументы, рукапісы, старадрукаваныя выданні, фотадакументы, графіка і іншыя), у мэтах іх найлепшага захавання дадзеныя музейныя прадметы з фондасховішчаў Музея для работы наведвальнікам Музея не выдаюцца. Наведвальнікі Музея карыстаюцца іх страхавымі копіямі.

21. Музей арганізуе работу наведвальнікаў Музея з музейнымі прадметамі і (або) музейнымі калекцыямі ў асобных і (альбо) службовых памяшканнях і ў абавязковай прысутнасці музейнага работніка.

Работа наведвальнікаў Музея з музейнымі прадметамі і (або) музейнымі калекцыямі ў фондасховішчах Музея не дапускаецца, за выключэннем выпадкаў, калі музейныя прадметы маюць вялікія памеры (скульптура, транспартныя сродкі, побытавыя рэчы і іншыя).

22. У мэтах забеспячэння захаванасці музейных прадметаў і (або) музейных калекцый і выключэння магчымых негатыўных уздзеянняў на іх доступ да работы з музейнымі прадметамі і (або) музейнымі калекцыямі, якія знаходзяцца ў фондасховішчах музеяў, можа быць абмежаваны, калі:

22.1. музейны прадмет і (або) музейная калекцыя маюць нездавальняючы стан захаванасці;

22.2. адкрыты доступ да музейнага прадмета і (або) музейнай калекцыі пагражае іх захаванасці;

22.3. музейны прадмет знаходзяцца ў працэсе кансервацыі ці рэстаўрацыі;

22.4. музейны прадмет і (або) музейная калекцыя знаходзяцца ў працэсе тэхнічнага афармлення, навуковых даследаванняў музейных работнікаў;

22.5. музейны прадмет і (або) музейная калекцыя з’яўляюцца асабліва каштоўнымі формамі пісьменнасці або выяўленчага мастацтва (дакументы, рукапісы, старадрукаваныя выданні, фотадакументы, графіка і іншыя) і не маюць страхавых копій;

22.6. музейныя прадметы знаходзяцца на спецыяльным уліку;

22.7. музейныя прадметы маюць статус гісторыка-культурных каштоўнасцяў і ўключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь.

23. Доступ да інфармацыі, якая змяшчаецца ў друкаваных і электронных каталогах музеяў, за выключэннем інфармацыі ў дакументах спецыяльнага ўліку, а таксама інфармацыі аб асобах, якія здалі ў музей музейныя прадметы, з’яўляецца адкрытым.

24. Інфармацыя аб паходжанні, кошце, дакладным месцазнаходжанні музейных прадметаў, зафіксаваная ва ўліковай дакументацыі Музея, з’яўляецца службовай, і доступ да яе абмежаваны.

25. Наведвальнікі Музея, якія атрымалі доступ да музейных прадметаў і (або) музейных калекцый, абавязаны зарэгістравацца ў спецыяльным журнале рэгістрацыі наведвальнікаў Музея і азнаёміцца з правіламі работы наведвальнікаў Музеяў з музейнымі прадметамі і (або) музейнымі калекцыямі.

26. Публікацыя выяваў музейных прадметаў і выкарыстанне інфармацыі аб іх ажыццяўляюцца толькі з дазволу Музея.

Выраб выяўленчай, друкаванай, сувенірнай і іншай тыражаванай прадукцыі і вытворчасць тавараў народнага спажывання з выкарыстаннем выяваў музейных прадметаў і (або) музейных калекцый, будынка Музея, аб’ектаў, размешчаных на тэрыторыях Музея, у тым ліку з выкарыстаннем іх найменняў і сімволікі, ажыццяўляюцца толькі з дазволу Музея.

## РАЗДЗЕЛ 6
## ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

27. Наведвальнікі Музея, якія парушылі вызначаны дадзенымі Правіламі парадак наведвання Музея і работы з музейнымі прадметамі і (альбо) музейнымі калекцыямі, могуць быць прыцягнутыя да адказнасці ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам.

28. Асобы, якія дапусцілі пашкоджанне ці страту музейных прадметаў і (або) музейных калекцый, нясуць адміністрацыйную, крымінальную і іншую адказнасць у адпаведнасці з заканадаўствам.

29. Асобы, якія прынеслі шкоду Музею , абавязаныя пакрыць страту ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам.